Anna Sakowicz

# Партызанская тэма ў аповесці "Пушчанская адысея" Аляксея Карпюка

Acta Polono-Ruthenica 20, 121-134

2015

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

UWM Olsztyn Acta Polono-Ruthenica XX, 2015
ISSN 1427-549X

Anna Sakowicz
Uniwersytet w Białymstoku

# Партызанская тэма ў аповесці *Пушчанская адысея* Аляксея Карпюка

Склалася так, што сацыяльна-палітычная рэчаіснасць вызначыла тое, што адной з галоўных тэм у пасляваеннай беларускай літаратуры была тэма вайны. Паколькі Беларусь была цалкам акупіравана праз партызанскі рух, то амаль усе беларускія пісьменнікі з ваеннага пакалення закраналі партызанскую тэму ў сваёй творчасці. Пра гэта засведчылі наступныя творы аўтабіяграфічнага характару: аповесць *Партызаны* (1960–1963) Алеся Адамовіча, аповесці *Круглянскі мост* (1969), *Сотнікаў* (1970) Васіля Быкава. І вось, Аляксей Карпюк, былы камандзір партызанскага атрада на Беласточчыне, не мог абмінуць такой тэмы.

Аповесць *Пушчанская адысея* з'яўляецца адным са значных твораў Аляксея Карпюка. У гэтым творы выяўлена шчырая, асабіста перажыта пісьменнікам-партызанам праўда аб вайне. Штуршок да напісання гэтага твора, паводле Уладзіміра Калесніка, ляжыць „у душы самога А. Карпюка, у пакутах яго ўласнай памяці, якая не знайшла маральнага ачышчэння ў рамантычнай фантазіі, а пакутавала і патрабавала суровай споведзі"[1].

Беларускі літаратуразнаўца Серафім Андраюк, які паходзіць з-пад Бельска Падляшскага, твор *Пушчанская адысея* Аляксея Карпюка акрэслівае як найбольш характэрны і вызначальны ў плане рэалізацыі партызанскай тэматыкі: „У станаўленні Аляксея Карпюка як чалавека і грамадзяніна, у фарміраванні яго як пісьменніка выключна важнае значэнне мела вайна. Увогуле, для ўсіх тых, хто прайшоў, перажыў вайну, яна засталася з імі на ўсё жыццё, вызначыла іх лёс – чалавечы і творчы. І ў кожнага творцы (у ягонай творчасці) вайна была свая, кожным асабіста пражытая і перажытая. Свая вайна і ў А. Карпюка. Разам з тым гэта і вайна родных мясцін, роднай зямлі. Такою яна паказана пісьменнікам у яго галоўным «ваенным» творы – аповесці *Пушчанская адысея*. Змястоўная аснова аповесці выключна аўтабіяграфічная. Як у сюжэце, так і ў вобразнай сістэме. У лёсе Алеся Кучынскага, галоўнага героя твора, даволі выразна высвечваецца лёс самога аўтара"[2].

У сваёй аўтабіяграфічнай аповесці А. Карпюк вывёў на пярэдні план Алёшу. „Кучынскі – гэта [...] смелы, рашучы, сумленны, дзесьці просталінейны, часам

[1] У. Калеснік, *Плён творчасці – дослед жыцця*, [у:] А. Карпюк, *Выбраныя творы ў двух тамах*, т. 1, Мінск 1991, с. 12.

[2] С. Андраюк, *Урок жыцця і творчасці*, „Літаратура і мастацтва", № 39, 16 кастрычніка 2009, с. 15.

пазбаўлены вытрымкі і разважлівасці. Ён сын свайго краю, сваёй зямлі. І для пісьменнка надзвычай важна было як мага паўней захаваць меру праўды і ў падзеях, сцэнах, і ў характарах, і ў падрабязнасцях, і ў перадачы агульнай эмацыянальнай атмасферы, абапіраючыся не толькі на памяць, але і ўлічыўшы досвед часу”[3]. І вось, пісьменнік паказвае партызанскую вайну вачыма 17–18 гадовага вясковага хлопца, земляроба.

Алёша трапіў у абоз на ўскраіне Гута-Міхалінскай пушчы. Да партызанаў Кучынскі прыходзіць з вопытам вязня лагера смерці ў Штутгофе, падобна як герой Янкі Брыля з рамна *Птушкі і гнёзды* (1964) Алесь Руневіч. Напачатку ніхто з партызанаў не цікавіўся Алёшай. Навапрыбылы разважае: „Няўжо мне давядзецца з’есці з імі славуты пуд солі, пакуль пачнуць мяне лічыць сваім?”[4]. Пачуццё локця з партызанамі, як чакаў гэтага Алёша, не навязваецца адразу. Там ніхто не чакаў уцекача з нямецкага лагера з раскрытымі абдымкамі. Яшчэ трэба, каб яму даверылі. Не павераць – расстрэл.

Алёшка ад Чыгрова дазнаўся, што ён, як чалавек неправераны, значыць небяспечны, мусіць здаць зброю і ісці на „губу” для высвятлення. Петрасянаў асабіст не мог паверыць, што можна ўцячы з палону, і то яшчэ з лагера смерці. „А чаму ж ты ў ім не загінуў, як іншыя?” (127) – бяссорамна дапытваецца Чыгроў. Кучынскі абураны, бо: „Колькі імкнуўся, цярпеў, ішоў з такімі прыгодамі і рызыкай...” (123), не толькі свайго жыцця, але перад усім блізкіх са Страшава, а таксама сяброў з лагера смерці, што за несправядлівасць. „Няўжо дарма я так імкнуўся сюды, дарма ахвяраваў сябе Валодзька? А як жа бацькі?!” (124).

Аднак і пазней партызанскае жыццё Алёшы не выглядала так як сабе ён раней уяўляў. А менавіта, Кучынскі прыйшоў у лагер змагацца з ворагам, а вымушаны быў выконваць гаспадарчыя абавязкі. „Хочацца ваяваць, дзейнічаць, развярнуцца, а ўсё маё геройства цяпер заключаецца ў тым, што запрагаю каня, еду на вёску, прывожу сена і бульбу. Часамі сяку на кухні дровы, стаю на варце” (130). Відавочна Алёша рваўся да барацьбы, хацеў нешта зрабіць супраць ворага, а яго спынялі, не давалі магчымасці выказацца.

Алёша ніколі раней партызанаў не бачыў. Упершыню сустрэў іх у Гута-Міхалінскай пушчы. Ідэалістычны вобраз лясных герояў ён стварыў сам.

> У маім уяўленні былі яны людзі рослыя, энергічныя, дужыя і хадзілі асабліва: пружыніста, лёгка, каб не пакідаць слядоў ды не трашчаць галлём, – толькі ўздымалі вопраткай за сабой вецярок (107).

На самой справе група Скарыпіна выглядала зусім інакш. Вось, якія першыя ўражанні Алёшы з прабывання ў партызанскім абозе:

---

[3] Ibidem.

[4] А. Карпюк, *Пушчанская адысея*, Мінск 2009, с. 107. Далей пры спасылцы на гэта выданне ў дужках падаецца старонка.

> Нават я сярод партызан – самы высокі. І крочаць яны цяжка, няўклюдна, шоргаюць халявамі, спатыкаюцца аб карэнні і пні. На адным чалавеку – вывернуты кажух, на другім – вайсковы шынель, на трэцім – дэсантная куртка, на чацвёртым – палітэчка-рэглан...
>
> Хлопцы чамусьці злыя і раздражнёныя: гыркаюць адзін на аднаго, кашляюць, чухаюцца, шморгаюць насамі.
>
> Адным словам, перада мной – зусім не тыя міфічныя героі, аб якіх столькі хадзіла легенд. Гэтыя людзі падобныя больш да дрывасекаў ці рамонтнікаў, якія, натаміўшыся за цэлы дзень на холадзе, змардаваныя ўшчэнт, валакуцца нага за нагу на спачын, і болей іх нічога не займае (107–108).

> Зноў з'явілася слова п а р т ы з а н ы. Яго вымаўлялі паціху, крыху набожна, укладвалі ў яго сваю надзею і любоў. Часамі замест п а р т ы з а н ы казалі проста – я н ы, гэта азначала – дужыя, адважныя і ўсясільныя волаты (191).
>
> Калі Алёша ўзарваў цягнік то сяляне доўга гэта ўспаміналі. Некалькі дзён вёскі толькі і жылі так, бытта наступіла вялікае свята. Ніхто нічога не рабіў. Людзі збіраліся па хатах і соты, тысячны раз апавядалі адны адным, што здарылася ў Сухіхі Багенцах з эшалонам (190–191).

Партызанам цяжка было жыць у лесе. Зусім іначшыя ўмовы побыту ў сваёй роднай хатцы. Факт, што партызаны ўвесь час жывуць у лесе, меў уплыў, перад усім, на іхні настрой. Яны ж дагэтуль не ўяўлялі, што круглае, гадавое прабыванне толькі на ўлонні прыроды можа быць праблемай. Пабыўшы нейкі час ў партызанскім лагеры Алёша пераконваецца, што зусім іншыя адносіны да наваколля, мае чалавек які жыве ў нейкай мясцовасці, побач з людзьмі, а зусім іншыя – той хто жыве ў лесе.

> Толькі потым, калі і сам паблукаў па лясах не адзін месяц, я зразумеў Скарыпіна. Гэта тым, хто з гарадской мітусні забрыдзе на хвіліну ў лес, хочацца зашыцца ў самы гушчар, падыхаць водарам зяляніны, пацешыць зрок далікатнымі фарбамі ды маляўнічымі контурамі крон, пабыць нейкі час самому з сабой. А людзей, якія вымушаны часта лазіць па глухіх ды бязлюдных кутках, падсвядома – як магнітам цягне бліжэй да абжытых мясцін (109).

У партызанаў жывучых у лесе было своеасаблівае адчуванне працягласці часу, які адмерваўся, лічыўся зусім інакш як у дапартызанскім жыцці.

Асаблівае месца ў лясным жыцці займае праблема сну. Ёй у *Пушчанскай адысеі* А. Карпюка, адведзена шмат увагі. Кучынскі разважае: „Дагэтуль я ведаў, што нармальныя людзі начуюць. Партызаны ўсю ноч ідуць, ставяць міны, робяць засады, вынюхваюць, выслежваюць, а потым – днююць" (110). Безумоўна, сон неабходны для адпачынку, для набірання фізічных, а затым, і псіхічных сіл. Калі чалавек жыве дома то не ўсведамляе, якое гэта шчасце выспацца ў сваім ложку. І Алёша Кучынскі, а пазней і яго сябры са Страшава, зразумеюць і ацэняць належным чынам гэтую з'яву калі прыйдзецца ім жыць у лесе. Яшчэ выносным з'яўляецца сон на зямлі вясной, летам і ранняй восенню, аднак зімою цяжка заснуць на халадным, мокрым снезе. Кожны, хто прыходзіць у партызанскі лагер, уражаны гэтым:

> Страшнае відовішча – людзі, якія спяць на снезе. Зямлістыя шэрыя твары. Цяжкае дыханне. У некаторых дрыжаць калені і ў такт чуецца жаласлівае скуленне, а боты бязладна соўгаюць па снезе. Адчуваю спагаду і братэрскае спачуванне (112).

Праходзіць чарговая ноч, настае час, калі трэба сябрам са Страшава Мішы і Віктару, будучым партызанам, „дняваць". Аднак добраахвотна ніхто з іх зімой не хоча легчы на зямлі. Кожны імкнецца адцягнуць гэты момант як мага далей на потым\ пазней.

> Сябрам абавязкова трэба адпачыць, ды заснуць на дварэ яны ўсё яшчэ не могуць. На гэты раз не сплю і я. Загаворваю ім зубы. Хлопцы зноў спрабуюць глушыць самагонку. Ды яна ўжо іх не бярэ – дзіва, бытта ў шклянкі булькаюць звычайную ваду! (195).

На трэція бяссонныя суткі чалавечы арганізм настолькі аслаблены, што становіцца абыякавым на пагрозу. Ноччу мужчыны ідуць у бліжэйшую вёску па ежу. Апынуўшыся ў цёплай хаце хлопцы засынаюць на хаду. „Не дапамагаюць ні ўгаворы, ні пострахі, ні штурханцы" (195). Алёша, як вопытны чалавек, усведамляючы сітуацыю, у апошнім гумне бярэ пару снапоў саломы і валачэ сяброў далей ад вёскі. Цяпер снег здаецца ім „мяккай коўдрай, цягне да сябе бы магніт" (195). І надыходзіць такая хвіліна, калі чалавек страшэнна змучаны. Аж да знемажэння фізічных сіл, і яму становіцца ўжо абыякавым дзе ён ляжа. Знясіленыя фізічна ад фарсіраванага шматгадзіннага маршу зімоваю, халоднаю парою па лесе, маладыя мужчыны толькі тады маглі заснуць на зямлі.

Паступова, з кожным днём прабывання ў Гута-Міхаліне, Кучынскі ўцягваецца ў партызанскую справу, набывае партызанскага вопыту і знаёміцца з іхнімі парадкамі. Алёша засвойвае прафесіянальную партызанскую тэрміналогію.

> Выяўляецца – дарога, па якой часта ездзяць немцы, ужо не дарога, яна – б а л ь ш а к.
> У Свіслачы не проста жывуць немцы з паліцаямі. Там стаіць – г а р н і з о н.
> А той з нашых, хто пайшоў у гэты г а р н і з о н служыць, – не проста паліцай, здраднік, прадажная шкура. Ён – бобік!
> Аднак найбольшую пашану выклікае таямнічае слова с у в я з н ы. Чалавека такога партызанам назваць мала. Днём ён расхаджвае па гарнізонах, таўчэцца сярод немцаў, мо нават выпівае з імі, як Міцька, скаліць зубы і – падглядвае, выпытвае, вынюхвае, матае на вус і матае, а ноччу дакладвае пра ўсё ў атрад, брыгаду. Яго дом уяўляю сабе калі не з радыёстанцыямі, то, прынамсі, з тэлефонамі, а над страхой – блытаніна правадоў-антэн.
> А яшчэ ў таямнічай Гута-Міхаліне, куды мы ідзём, кухар Салвесь гатуе якісьці дзіўны партызанскі суп – рататуй! Хлопцы два тыдні ядуць усухамятку, адно і гавораць аб ім...
> Ну і жыццё ж у мяне пачынаецца – як казка! (111).

А. Кучынскі захоплены партызанскім жыццём, як малы хлопчык, які ўбачыў салдатаў. Яму хочацца жыць па-вайсковаму, проста дзейнічаць у слушнай справе. Тут праявілася яго натура, як шчырага патрыёта, чалавека адданага Радзіме. Відавочна, што побыт у партызанскім лагеры выклікае ў героя *Пушчанскай адысеі* светлы настрой, ён ашчасліўлены\узрадаваны:

> Першы раз у жыцці стаю на варце. За ўсю вайну ўпершыню ў мяне на душы такая яснасць. Не трэба ні хітрыць, ні прыкідвацца, ні кагосці ашукваць. На свеце шугае

> страшэннае зло. Але ў маіх руках зброя, за мной сябры, і мы ствараем самастойную ды незалежную дзяржаву, якая зла гэтага не баіцца! Я тут і за Валодзьку, і за бацькоў, і за сяброў, і за ўвесь свет! Мяне ўсяго распірае ад рашучасці, пераможнай гордасці ад сваёй місіі (110).

Алёша выпаўняе сваю місію. Аднак, спакваля пачуццё радасці, шчасця пераплятаецца з балючай сведамасцю памылак. Пра недахоп ваеннага вопыту сведчыць сцэна, калі партызаны выконваюць спецзаданне. Іхняя справа не ўвязвацца ў бой з кожным фрыцам, а – зрабіць сваё і вярнуцца ў лагер. Пра гэта Алёша Кучынскі даведаўся не ў час.

Варта зазначыць, падкрэсліць, што ніхто з Кучынскіх не служыў у арміі. Увесь вайсковы вопыт Аляксея невялікі. Герой сам шчыра прызнаецца:

> Я ў тэхнікуме праходзіў вайсковую падрыхтоўку. І нікога з нас не вучылі, як пускаць пад адхон цягнікі (184).
> Сябрам маім крыху лягчэй. Яны вераць, што я ўсё ведаю. Як жа – знаходзіўся з паўгода ў дэсантнікаў, прыбыў з таямнічай Гуты. Ім і ў галаву не прыходзіць, чым я там займаўся! На маё шчасце, сябры саромеюцца мяне пытацца пра свае абавязкі: каму прыемна паказвацца невукам? (251).

Праблема няведання ваенных спраў вяртаецца калі спатрэбіцца выкарыстаць гэты тол, каб сарваць мост або цягнік. Калегі папрасілі Кучынскага, каб навучыў іх дабываць тол са снарадаў, а ён саромеўся прызнацца, што ведае толькі прыблізна як гэта робіцца.

> У снарадзе – галоўка ўзрывацеля, яе адкручваюць і са снарада нейкім чынам дастаюць гэты самы тол. Неасцярожны рух адзін.. і лепш не думаць, што тады будзе. На галоўцы спецыяльныя дзірачкі для ключа. Мы ж не артылерысты, адкуль у нас можа быць такі ключ? Колькі самаробных піратэхнікаў гэтак склала галовы ў навакольных лясах, і страшна пра гэта і падумаць (295).

На шчасце на выручку маладому камандзіру прыходзіць вопытны Смірноў. „Нельга мне ўсюды лезці самому, людзям трэба давяраць больш...” (296) – развважае\ усведамляе Кучынскі.

Вядома, ніхто не нараджаецца з вайсковым вопытам, ён заўсёды прыходзіць з часам. Аднак, каб камандаваць партызанамі патрэба яшчэ нешта важнейшае, а менавіта зручнасць да зразумення патрэб і настрояў людзей, своеасаблівая ўражлівасць, інтэлігенцыя, а таксама адчуванне і разуменне небяспекі сітуацыі і часу. Бо сапраўды, добры камандзір гэта чалавек, які клапаціцца пра сваіх салдатаў, не рызыкуе іх жыццём без прычыны, спярша патрабуе ад сябе а не ад падначаленых, дасканалы дыпламат, выдатны арганізатар, рарытэтны патрыёт.

Кучынскі ролю камандзіра ўяўляў наступным чынам:

> Камандзір увесь час насцярожаны, адчувае сваіх людзей, і яны – працяг яго ўласных нерваў і мускулаў, а пачуццё адказнасці заўсёды прымушае быць напагатове. Ён – бытта шафёр, які едзе па небяспечнай дарозе і яго рукі ды ногі на рычагах, напружаны і не дрыжаць таму, бо ён падрыхтаваны да найгоршага і адказнасць за людзей у яго заглушае трывогу аб сваім лёсе (310).

Варта пагадзіцца з Міхасём Тычынай, што галоўны герой *Пушчанскай адысеі* „натура актыўная, валявая, у пэўнай меры авантурная, прынамсі, ён спрабуе ўзняцца над падзеямі, быць гаспадаром свайго лёсу і шчасця”[5]. У асобе Алёшы гэтыя грамадзянска-культурныя каштоўнасці спалучыліся.

Шчыры і бескампрамісны характар Алёшы заўважыў камбрыг Вайцяхоўскі, абвеяны легендай горны інжынер, дэсантнік, капітан. Ён убачыў у Алёшы, што яму хочацца „зрабіць штосьці такое незвычайнае, каб усе ахнулі” (110). Вайцяхоўскі, даведаўшыся як Чыгроў паступае з Кучынскім, і супраць волі асабіста Петрасяна, подступам уключыў страшаўскага хлопца ў свой атрад. У брыгадзе Вайцяхоўскага Алёша аджыў. Пачалася для яго новае, лепшае жыццё, якое перайшло з функцыі забяспечвання абозу харчаваннем да сапраўднай партызанскай дзейнасці. „Партызаны! – адкрываю сабе новы адценак гэтага слова. Каб адно гэтая хваля не захлынула тут мяне, каб выйсці з катавасіі жывым” (231).

А з бягом часу, спазнаўшы яшчэ лепш Алёшу, камбрыг Вайцяхоўскі назначыў яго камандзірам новаарганізаванага чацвёртага атрада ў яго брыгадзе, імя Кастуся Каліноўскага. Цяпер Алёша адчуў сапраўдную сутнасць жыцця: „Камбрыг вызначыў мне камісара, начальніка штаба. На месяц уперад перадаў паролі. Даручыў адрасы сувязных і параіў, як сябе ў кожным выпадку паводзіць” (246).

Напачатку партызанская група Кучынскага складвалася з шасці асоб: Алёшы, Ліды, Сяргея Папроцкага, Косці Карповіча, Міцькі Карповіча і Сашкі Кардаша. Потым, калі атрад перажываў паласу ўдач, колькасць членаў павялічылася да трыццаці асоб.

Напачатку ўсяго нехапала. Трэба было літаральна усё нанава да жыцця ў лесе, а перад усім здабыць зброю.

> У Сашкі – кулямёт. Пад сасной стаяць Лідзін і Сяргееў карабіны. У Косці і ў мяне па аўтамату. У Міцькавай кішэні – два пісталеты. Такая наша ўся зброя – з дзесятак ствалоў. Абсмаленае вядро, кацялкі, мяшочкі з бульбай, крупой, цыбуляй і соллю ды загорнутае брызентам сала – таксама часткі атрада: яго маёмасць. І з гэтым найгорш. Кожны дзень ламай галаву, як запасы папоўніць, зберагчы ад мурашак, – бо жыццё без гэтых мяшочкаў, вядра і кацялкоў не вясёлае (248).

У камандзірскай спецыфіцы выяўляецца індывідуальнасць самога Кучынскага. Алёша, з бегам часу, становіцца для сваіх партызанаў кімсьці больш чым толькі камандзірам. „Я разумею вартасць іхняга ўздыму [моладзі – А.С.], нутром адчуваю яго сілу ды ведаю – злачынства яго не выкарыстаць. І ў той жа час шкада маіх хлопцаў” (294). Кучынскі-камандзір часта паводзіць сябе як спагадлівы, беражлівы бацька, які шкадуе сваіх падапечных. Алёша наступным чынам раздумвае аб сваіх вайсковых калегах:

> Ведаю ўсе вашы, хлопчыкі, слабасці – як вас на пост цяжка выправіць. Як трэба напамінаць лішні раз, каб прачысцілі ствол, пагаліліся, ды і ў кашулі вашы трэба заглянуць... На новым месцы завяду і новыя парадкі. (305).

[5] М. Тычына, *Адысея праўдалюбца. Жыццё і творчасць Аляксея Карпюка*, „Роднае слова” 1995, № 4, с. 18.

Пакуль камбрыг Вайцяхоўскі быў побач усё здавалася Кучынскаму простым і зразумелым. Як толькі не стала вопытнага камандзіра, так і паявіліся першыя клопаты. „У атрад папрасіліся знаёмыя хлопцы, а чым іх узброіць? З паўстанка забраў кулямёт, гранаты [...]. А тут яшчэ ўвязаліся нямецкія агенты” (246). Некалькі чалавек з Гомля, гаварыла, што былі вывезеныя немцамі на работу і ім удалося ўцячы. Цяпер яны надта хочуць ваяваць. Потым акажацца, што яны былі небяспечнымі шпіёнамі са школы ў Альбертыне, пад Слонімам, і мелі смяртэльны цыяністы калій.

Адначасова Кучынскі ўсведамляе, што яго хлопцы не былі яшчэ ні разу ў сапраўдным баі. Партызанам атрада імя Каліноўскага не хапае вопыту, падрыхтоўкі. Алёша разважае:

> Хочаш, каб табе Ліда з іржавым карабінчыкам дараўнала ў адкрытым баі бываламу нацысту-франтавіку?! Не дай бог спаткацца цяпер з імі – хай гэта здарыцца потым, калі набяром вопыту і закалкі!... (303).

З дапамогай прыходзіў бацька. Яго парады былі для Алёшы таксама вельмі важнымі. Ён як вопытны чалавек заўсёды памагаў добрым словам, або крытыкаваў, калі была такая патрэба, неаднойчы студзіў азарт і нецярпімасць сына. Бацька Кучынскага памагаў партызанам таксама і ў арганізацыйных справах, у матэрыяльных патрэбах, у харчы, а перад усім быў неацэннай крыніцай ведаў, інфармацый аб тым, што адбываецца ў наваколлі і што гавораць людзі.

> Мы з бацькам маем умоўнае месца, яно называецца поштай. З краю лесу расце некалькі густых елачак. Пад імі кладзём сабе пасылкі. Каб не вытаптаць туды сцежкі, я на крайняй сасне вешаю паперку. Бацька праз акно на кухні бачыць белую лапінку і толькі тады пасяшае на „пошту”. Мне ён вешае паперку на прасецы – сыну так ямчэй. (243–244).

Дзякуючы бацьку Алёша меў распазнанне ў сітуацыі. З бацькам Алёшы лічыліся ўсе, не толькі сын, але і вяскоўцы, і партызаны. Ён быў галоўным козырам для партызанаў.

Дасканала гэта ўсведамляў Валянцін Філімончык, камандзір Дубаўскага атрада. Ён зайздросціць Алёшы, што ён дзейнічае ў роднай старонцы і таму да любой акцыі не мусіць прасіць праваднікa. Ды яшчэ мае побач памагаючага бацьку.

Інтуіцыя бацькі падказвала, што гэта Алёша стрэлку пашкодзіў у Валілах (падчас побыту ў Страшаве, калі меў загад загітаваць некалькі людзей да партызанаў). Стрэлку праз гадзіну замянілі, а трох мужчын з суседняй мясцовасці, што ў гэтым месцы вартавалі чыгунку, эсэсаўцы адразу арыштавалі і ніколі не адпусцілі на волю. Бацька не мог гэтага дараваць сыну.

> Стрэлку пашкодзіў!.. Ат, глупства! – Бацька нядобра зыркае на мяне, і мая душа ўлазіць у пяткі. – Стрэлку праз гадзіну замянілі, а трох мужчын з Меляшкоў, што ў тым месцы вартавалі чыгунку, эсэсаўцы адразу арыштавалі! (180).

Да Алёшы прыходзіць усведамленне: „Ліха на яго, закалдаванае кола! Шчасце, што не стрэліў ля барака ў таго немчыка. Калі б яшчэ забіў і салдата, то сёння сто галоў у Валілах развіталася б з жыццём, а я там ведаю і старога і малога” (181).

Паводле Міхася Тычыны галоўны герой *Пушчанскай адысеі* „да ісціны ён ідзе праз чараду памылак, якія ў час вайны дорага абыходзяцца не толькі яму самому, але і ягоным блізкім. Плата за гэтыя памылкі часта вельмі высокая: чалавечае жыццё”[6]. Тут паказана праблема мэтазгоднасці партызанскіх аперацый, калі за іх расплочваюцца мірныя людзі, часта суседзі. Гэта вельмі істотная праблема, у той час. На гэту трагедыю. Драму ваенная літаратура звярнула ўвагу на шмат пазней чым тая, якая ўзнікла ў кароткім часе пасля вайны. Неаднойчы літаратура ставіла пытанне ці варты поспех дасягнуты коштам чалавечых жыццяў. Гэту праблему ўздымае напр. В. Быкаў у аповесці *Круглянскі мост*.

Алёша зразумеў, што нельга рызыкаваць жыццём людзей, асабліва навакольных жыхароў вёсак, якія дапамагаюць партызантам. Спецыфіка партызанскай вайны ў тым, што партызаны апіраліся на маральную і матэрыяльную падтрымку мірнага насельніцтва. Таму ў дасягненні сваіх вайсковых мэтаў яны павінны былі ўлічваць і інтарэсы гэтага насельніцтва, не злоўжываць давер’ем сялянаў. Таму Кучынскі абураецца, калі Філімончык хоча правесці дыверсію каля яго роднай сядзібы (насупраць ягонага хутара). Алёша гаворыць, што з-за двух немцаў, мала істотных для перамогі над фашыстамі, эсэсаўцы могуць помсціць усяму Страшаву.

У *Пушчанскай адысеі* А. Карпюк паказвае розніцу паміж партызанамі а прафесіянальнымі вайсковымі. „Дзесьці за сотні кіламетраў адгэтуль стаіць фронт. Там – тварам у твар дзве арміі. Мы [партызаны – А.С.] дапамагаем сваёй у тыле праціўніка” (266). Алёша Кучынскі ўсведамляе, што „Адкрыты бой з рэгулярнымі часцямі не партызанскі занятак” (354). Тым больш, „Куды нам вылазіць супроць узброеных да зубоў дывізій, якія адступаюць зараз не менш арганізавана, як у сорак першым наступалі [...]. Засталося нас чалавек шэсцьдзесят, сярод іх жанчыны і людзі зусім яшчэ свежыя, неабстраляныя. З імі з лесу не высунеш і носа. Адным словам, нам цяпер – сядзі, цярпі і чакай, прытаіўшыся ў Перацёсах” (376).

Задачай лясных герояў з’яўляецца ўзрыў нямецкіх цягнікоў, якія ідуць на фронт, або з яго вяртаюцца. Аднойчы Алёшы ўдалося за двое сутак перавесці сабатажныя акцыі ў Саколе і ў Зубках. Кожны ўзарваны цягнік цешыў таксама жыхароў навакольных вёсак. „Усе ўбачылі: вораг не такі і страшны, ёсць людзі, якія нават яго б’юць і яны знаходзяцца недзе побач” (191). Успышка народнай фантазіі пры перадачы такіх падзей не мела граніц\межаў. „Пры такіх фантастычных апавяданнях нямецкая разведка, вядома, нічога не магла раздабыць. Нікога не арыштавалі” (191).

Заўважаецца, амаль у цэлым творы ў А. Карпюка схільнасць да мастацкага ўзнаўлення жыцця цесна звязанага з асабістым жыццёвым вопытам аўтара. Пры тым, трэба падкрэсліць, што „Празаік тонка адчуваў грань паміж цікавым і нецікавым для чытача, аддаючы звычайна перавагу яркім эпізодам, выхапленым з жыцця, пачутым ад іншых, часта проста вытанчаным”[7].

[6] Ibidem, с. 20.
[7] Ibidem.

Алёша размясціў людзей прысланых Марусяй у Скрабляцкім лесе, які ад Ліпнікаў аддзяляла шаша. Зрабіў так для бяспечнасці сваіх людзей. Кучынскі пасля выпадку з гамяльчанамі, якія аказаліся здраднікамі, стаўся больш асцярожны. Выкрытыя ворагі ў Альбертыне, пад Слонімам, скончылі школу здраднікаў. Кучынскі хацеў добра прыглядзецца новапрыбылым, бо гісторыя людзей прысланых у сямейны абоз праз Марусю напаміналa лёс гамяльчан. Іх таксама „немцы везлі на работу ў Германію, не давезлі і пакінулі ў Беластоку на аэрадроме. Сярод дваццаці знайшоўся нават прапаршчык царскай арміі” (256). Камандзір Кучынскі даў ім з асцярожнасці толькі тры вінтоўкі для самааховы, бо пабаяўлся даць больш. Падрабязна расказаў, куды можна хадзіць, куды нельга. „Каб цяпер хто-небудзь з беластачан захацеў нас прадаць, то зрабіць гэта не так проста – дзе мы стаім, беластачане не ведалі” (256).

Роля дзейнасці Марусі для партызанскага руху неацэнная. Яна, між іншым, здабыла ад немцаў чарцяжы вызначаных пазіцыі зенітных батарэй ў Беластоку і план новай дыслакацыі авіячасцей „Люфтвафы”. Маруся таксама падаравала сумку з чырвоным крыжам поўную розных неабходных лякарстваў.

Аляксей Карпюк у аповесці *Пушчанская адысея* закранае яшчэ адну важную тэму – ўзаемаадносіны нацыянальных меншасцей на паўночна-ўсходняй тэрыторыі Польшчы. Сітуацыя ў мясцовасцях на поўнач ад Скрабляцкага лесу была складанай. Там партызаны не паказвалі носа, бо адразу ўзнікала страляніна паміж імі а „самааховай”, якой верхаводзіў солтыс Тарноўскі пры дапамозе салдатаў са Крынкаўскага гарнізона. Штаб брыгады партызанаў загадаў гэтыя вёскі асвоіць. Неаднойчы Кучынскі з Вайцяхоўскім ламалі галаву як гэта выканаць. І вось здарыўся выпадак з сямейным абозам, які разграміў Тарноўскі. Алёша задумаў расправіцца са здраднікам.

> Хочацца абрынуць на здраднікаў такую дубіну, каб адным махам скрышыць змяінае гняздо. Не быць мне камандзірам у гэтым раёне, калі не выкараню іх! Яшчэ ў Гута-Міхаліне чуў, як у адным месцы пераапранутыя за немцаў партызаны абдурылі прадажнікаў і іх перабілі, хоць ніхто з хлопцаў не ведаў і слова па-нямецку, чаго ж баяцца мне? (262).

Кучынскі ідзе ў Каўняны каб помсціць. Вайна нараджае розныя пачуцці, безумоўна, перад усім раскрывае ў кожным усё, што найгоршае.

Аперацыя ў Каўнянах узнікла на гарачую руку. Калі Алёша ехаў да гэтай мясцовасці, то не ведаў што і хто яго там чакае. Аднак, на шчасце, лёс выратаваў героя ад небяспекі. Перад яго прыездам немцы толькі-што апусцілі вёску. У Каўнянах Кучынскі іграе ролю нямецкага салдата. Ён вачыма гітлераўца назірае як паводзяць сябе жыхары гэтай мясцовасці да яго – як немца і да яго сябра Мішы, які іграе – палоннага-ўкраінца, і які мае быць у кароткім часе расстраляным. Алёша, пачуўшы як жанчыны заахвочваюць Мішку, каб уцякаў ад бандытаў, то яму „здаецца”, што ён сярод сваіх блізкіх. Ён адчувае, што простыя сяляне, якія чыстасардэчна спачуваюць палоннаму, ніякага дачынення да банды Тарноўскага не маюць.

> – Сыно-йчак, табе сама жыць! – чуваць ужо з натоўпу. – Цябе застрэляць, як аман у пацеры! Лепш уцякай ад іх, сынок! Даедзеце да могілак і бяжы! (...)

– Многія адтуль уцякалі! За вёскай будзеш бачыць крыжы і кусты – не будзь дурнем, сынок! – горача пераконвалі Мішку ўжо іншыя.
Мне цяпер здаецца, што я сярод нашых, страшаўскіх цётак. Ледзьве сябе прымушаю іграць далей, важна накіроўваюся з прыступак на вуліцу (276).

А. Карпюк у гэтай сцэне паказвае перажыванні, эмоцыі свайго героя.

Гледзячы на саламяныя стрэхі, мірныя бярозы і вербы з буслінымі гнёздамі, ужо не адчуваю ўздыму – ва мне толькі цягучы і непрыемны абавязак (266).
Сашка спакойна выбірае сабе відэлец. Косця разглядае на святло чатырохкутны буталь. [...] А ў мяне пачынаюць дорбненька выстукваць зубы. Страшэнна зайздрошчу сябрам – чаму я адзін такі трус? (272–273).

А. Кучынскі ўбачыўшы сялянскія прылады ў Тарноўскага, абудзіў у сабе гаспадарскія пачуцці, ледзь прымусіў сябе далей іграць ролю немца. У яго не было настрою, каб забіць ворага. „Вось так цяпер, у даную хвіліну, пры яго старой жонцы, у белы дзень – забіць тут ля гэтага кацяняці малапісьменнага дзядзьку, які гасцінна так клапоціцца" (273). Выканаць заданне дапамагае выпадак. Толькі тады, калі солтыс сам напомніў аб сваім нялюдскім характары, калі дастае з капца наган і хваліцца, што з яго застрэліў бальшавіка, уражаны Алёша забівае Тарноўскага.

Разгром "самааховы" Тарноўскага быў пераломным ў адносінах жыхароў паўночных вёсак да партызанаў. Пасля здарэння ў Каўнянах, жыхары гэтай мясцовасці, рэшту зброі адвезлі крынкаўскаму амтскамісару. Падобна зрабілі іншыя вёскі. Аднак мужыкі з Азяран і Голікаў прыслалі да Міцькі паслоў і прапануюць, каб гэта партызаны зброю забралі ад іх. Яе столькі, што цэлую роту можна ўзброіць.

– Разумееце? – Міцька працягвае. – Учора вы, чэрці, адным махам асвоілі ўвесь паўночны раён! Ад паслоў адбою няма! Да майго бацькі валяць! Адкуль, заразы, толькі і даведаліся, што мае стары сувязь з партызанамі! Прыстаюць да старога і прыстаюць! Просяць, каб ім даравалі. Кажуць, думалі, што ў лесе толькі бандыты швэндаюць! (288).

Спакваля, пасля цяжкіх хвілін, адзначаных фізічнымі і псіхічнымі пакутамі, прыходзіла доўгачаканая і жаданая перамога. Самым значным дасягненнем Алёшы, якога не пасаромеўся б і прафесійны афіцэр, быў майстэрскі фартэль у Каўнянах. Гэта была ўсім партызанам патрэбная ўзнагарода за іх ахвярнасць для сваёй Радзімы.

Столькі зброі нават нам не снілася! Хутчэй, бо крынкаўскі амтскамісар ачухаецца і здагадаецца раней нас раззброіць „самааахову"!..
Калі на жыццёвым шляху кожнага чалавека трапляюцца і праўда свае гордзіевы вузлы, то я ўпэўнены, гэта быў – мой. Аж дух займае ад перспектывы, якая перад намі адкрываецца пасля выпадку ў Каўнянах.
Ніколі, здаецца, не быў я гэтак шчаслівы (289).

Падзеі ў Каўнянах былі вельмі важнымі, зваротнымі ў „партызанскай адысеі" А. Кучынскага. Істотным ёсць тое, што Алёша набраў самаўпэненасці, веры ў сябе. Ён паказаў сябе як сапраўднага стратэга, пінкрэтона, які ўмее лагічна ацаніць сітуацыю. Як у жыцці бывае, не адбылося без страт. Балючым успамінам будзе смерць сувязнога партызанаў, пра якога Алёша нічога не ведаў. Міма таго, Кучынскі мае адвагу сцвердзіць: „Я, камандзір, вінаваты найбольш. Сяджу – нібы вады ў рот

набраўшы. Выяўляецца, яшчэ і золата мы празявалі!..” (285). Такія шчырыя словы прыходзяць у галаву толькі сумленнаму чалавеку.

Значнай з’яўляецца сцэна апошняй сустрэчы ў лесе партызанскага атрада з нямецкімі войскамі ў ліпені 1944 года. Як вядома, у гэты час мелі месца апошнія ваенныя дзеянні на беластоцкай зямлі. І вось, у такі час, дзякуючы выпадковасці, партызанам удалося рассеяць цэлую вайсковую адзінку, часткова яе абяззброілі. Кучынскага здзіўляе факт, што калі было ўсім вядома, што немцы прайграюць вайну, то нямецкія салдаты былі верныя Гітлеру да канца. Вось фрагмент размовы Алёшы з нямецкім афіцэрам:

– [...] Чырвоная Армія вас разграміла ўшчэнт! Войскі Гітлера рассыпаюцца, вы ж самі бачыце! Каму патрэбна ваша бяздумная ўпартасць і трупы, Германіі?
– А! – уразумеў ён нарэшце. – Гэта толькі мы трапілі ў палон. Вайна яшчэ не скончылася. Мы яе напэўна выйграем.
– Го, вы-ыйграеце? – Я не веру сваім вушам.
– Безумоўна!
– Але – я-ак?
Немец ужо стараецца мяне пераканаць:
– Фюрэр яшчэ не пусціў у ход сакрэтнай зброі. Чакае, пакуль наступіць канцэнтрацыя варожых армій, тады адразу зробіць усім капут – і бальшавікам, і Англіі, і Амерыцы!
Я ўважліва да яго прыглядаюся. Не, ён не маньяк. Усяму, што сказаў, немец і сам верыць (392).

Спосаб далучэння да партызанаў адбываўся сакрэтна.

Косця з Кардашом проста ў лес пайсці не маглі і разыгралі спектакль. Знаёмыя праводзілі іх да Валіл, паднеслі чамадан і торбы з ежай. Пасадзілі ў поезд. У Беластоку Сашка з Косцем панапісвалі ў адкрытках, нібы яны ў Кёнінгсбергу зарабляюць добрыя грошы на заводзе, аддалі напісанае той жа Марусі, а самі – да мяне ў Ліпнікі! Косцева жонка і Сашкава маці атрымалі цяпер па пошце з Кёнінгсбергскай пячаткай адкрыткі, абносяць па суседзях, выхваляюцца, як іхнія мужчыны добра ўладкаваліся ў Германіі – маюць і асобныя кватэры і зарабляюць па дзве сотні марак, а белага хлеба ядзяць там – колькі хочуць! (250)

Сам Кучынскі прызнае, што людзі ідуць у лес „наслухаўшыся фальклорных легенд аб партызанах, гэтыя людзі ўяўлення не маюць, як у лесе ўсё складана: нават хлеба кавалак дастаецца не проста. З Беластока ж гэтыя направіліся да нас з чамаданамі, святочнымі касцюмамі і сукенкамі, з адпрасаванай бялізнай нават, бытта тут ім выдзеліць меліся пакоі з водаправодам і электрыкай” (259). Бясспрэчна, некаторыя не мелі ніякага ўяўлення аб партызанскім жыцці.

У аповесці *Пушчанская адысея* паказана сутыкненне спрадвечнага парадку на зямлі гаспадара-земляроба са знішчальнай сілай вайны, якая супраць чалавеку. Вайна паказана вачыма земляроба, які жыве адным жыццём з усім, што мае патрэбу ў міры, цішыні.

Вайна – варварства, агульнавядома. Але ў баі ў мужчыны прачынаецца якійсьці звярыны інстынкт, і тады ён пачынае адчуваць вялікую сілу асалоды, што забіў праціўніка ці абдурыў мацнейшага за сябе ворага. Значна большае адчуванне паспытае чалавек, калі такой радасцю агорнута цэлая твая кампанія. (354).

Асаблівую вастрыню набывае для кожнага чалавека вычуванне роднага ў складаны сацыяльна-палітычны час. Радзіма галоўнага героя *Пушчанскай адысеі* паказваецца праз прызму трагічнай пары. Роднае Страшава і сям'я адыгрываюць ролю апірышча для Алёшы Кучынскага-партызанскага камандзіра і фарміруюць як патрыёта вернага роднаму.

У беларускай „ваеннай" прозе выразна ўвасабляецца думка, што на акупіраванай тэрыторыі не было выразнай мяжы, якая падзяляла баявую акцыю супраць ворага і пабытавае існаванне. Адно было цесна звязана з другім, і адно пераходзіла ў другое. У аповесці *Пушчанская адысея* А. Карпюка вайна выкрываецца вачыма тых, каму яна здавалася такой чужой, бессэнсоўнай, дзікай. Так, Алёша разуме, што пасля разгрому іхняга абозу ў Ліпніках, трэба ратаваць сваіх бацькоў, а таксама і блізкіх сяброў з атрада. Маці Алёшы вельмі перажыла, што трэба пакінцуь на разбурэнне хату, абжытую і дагледжану гаспадарку, што каб выжыць трэба ўцякаць у лес. Але, як слушна заўважае цётка Кірыліха, „з лесу вяртаюцца, а з пяску – ніколі!" (325). Маці так ненавідзіць немцаў, што не хоча, каб яны памаглі сабраць пераспелае збожжа з поля. Ганарлівая, амбіцыйная маці хоча, каб яны хутчэй сышлі ёй з вачэй, каб здаць іх у палон. „Здавай. Здавай іх пад халеру хутчэй, на які чорт яны табе здаліся, пакосім і самі!" (394).

Мае рацыю С. Андраюк сцвярджаючы, што Аляксей Карпюк у аповесці *Пушчанская адысея* „дакладна, пераканаўча паказвае якраз народны характар партызанскай вайны, яе складанасць, яе ў многіх адносінах стыхійнасць. Яму ўдаецца выявіць унутраную неабходнасць узнікнення ўсенароднага супраціўлення ва ўмовах варожага нашэсця, парушэння адвечнага ладу і парадку сялянскага жыцця. Супраціўленне нараджалася натуральна, арганічна. То быў як бы вымушаны пераход чалавека, селяніна-працаўніка, з аднаго жыццёвага стану ў іншы – нязвыклы, але адзіна неабходны"[8].

Вобразы-ўспаміны аб родным Алёшы Кучынскага вельмі цёплыя і створаны з вялікай любоў'ю і пашанай да роднага. Яны сведчаць аб унутранай прыгажосці характару галоўнага героя і яго прывязанасці да спазнанага ў дзяцінстве. Алёша, дарослы мужчына, партызан, не можа жыць без цяпла сям'і, суседзяў-землякоў і радзімы: „Ад цяпла родных вуглоў агортваюць успаміны. На пару дзён бытта забываю, што я партызан, што прыбыў з заданнем" (162). Вернасць Радзіме і сваім поглядам мае вялікую сілу і ўмацоўвае ў драматычным штодні галоўнага героя *Пушчанскай адысеі* А. Карпюка.

У творах А. Карпюка выразна бачыцца не толькі лёс героя, але і праглядваецца адчувальна лёс народа, краіны: „праз узнаўленне складанага перапляцення рэальных падзей і сітуацый, праз вобразную сістэму"[9]. Сціплы чалавек, аб вялікіх грамадскіх пачуццях, агульны інтарэс ставіць вышэй чым свой асабісты. Відавочна Аляксей Карпюк пісаў без аглядкі на крытыкаў, па загаду гарачага сэрца вернага

[8] С. А. Андраюк, *Аляксей Карпюк*, [у:] *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя*, т. 4, кн. 2: *1986-2000*, Мінск 2003, с. 281.

[9] С. Андраюк, *Урок жыцця і творчасці*, с. 15.

сына страшаўскай зямлі. У аснове жыццёвай філасофіі самога пісьменніка, і яго героя Алёшы Кучынскага, тры галоўныя моманты, якія спрадвеку складвалі мараль сялян – парадак, сумленнасць і праўда.

Выдатны беларускі даследчык Серафім Андраюк падкрэслівае, што ў творы *Пушчанская адысея* „для пісьменніка надзвычай важна было як мага паўней захаваць меру праўды і ў падзеях, сцэнах, і ў характарах, і ў падрабязнасцях, і ў перадачы агульнай эмацыянальнай атмасферы, абапіраючыся не толькі на памяць, але і ўлічыўшы досвед часу"[10]. Сапраўды, у *Пушчанскай адысеі* ўражваюць хараство і жывасць малюнкаў-ўспамінаў пра радзіму-гняздо, напоўніцу выяўляецца мастацкі талент пісьменніка.

А. Карпюк у кожным радку свайго твора, стрымана і дакладна, без лішніх эмоцый, стварае вобраз Алёшы Кучынскага як перакананага, свядомага беларуса. Так, менавіта беларушчына, служэнне ёй, было наканавана галоўнаму герою *Пушчанскай адысеі*. Падзеі, учынкі героя А. Карпюка, апісаныя ў аповесці, самі сведчаць за сябе.

У цэнтры ўвагі аказалася псіхалогія простага чалавека, аналізавана ў адметны спосаб і ў розных прасторах. Ва ўсіх творах А. Карпюка заўважаецца тэндэнцыя да рэалістычнага апісання рэальнасці з пункту погляду псіхалогіі героя. Менавіта, гэта ўсхапленне перамен, якім падлягала ваенная рэчаіснасць, іх уздзеянне і наступства для беларусаў адлюстраваны ў партызанскай аповесці. Сувязь чалавек – рэчаіснасць ляжала ў аснове творчасці А. Карпюка ад самага пачатку яго пісьменніцкага шляху. Аналіз стаўлення героя да наваколля і спосаб яго ўвасаблення з'яўляецца сутнасна абгрунтаваным метадам даследаў усёй спадчыны празаіка А. Карпюка.

Пра стылёва-вобразныя асаблівасці *Пушчанскай адысеі* А. Фядута піша, што: „Побыт – вось тое, што ўдавалася паказаць Карпюку, можа быць, як нікому з сучаснікаў"[11].

У аповесці *Пушчанская адысея* А. Карпюка з'яўляецца тое, што партызанская вайна паказана на тэрыторыі Беласточчыны. „Аўтар не дае ў аповесці шырокіх, разгорнутых карцін партызанскай барацьбы, зусім мала месца займае апісанне баявых аперацый. Вялікая ўвага адведзена паказу штодзённага жыцця сялян ва ўмовах акупацыі і партызанскіх будняў. Аляксею Карпюку ўдаецца выявіць унутраную неабходнасць узнікнення ўсенароднага супраціўлення ва ўмовах варожага нашэсця, парушэння адвечнага ладу і парадку сялянскага жыцця. То быў як бы вымушаны пераход чалавека, селяніна-працаўніка, з аднаго жыццёвага стану ў іншы – нязвыклы, але адзіна неабходны"[12].

А. Карпюк апісаў тое, што ведаў найлепш – праблемы і вобразы партызанаў, якія дзейнічалі на яго роднай зямлі. Партызнаская рэчаіснасць на Падляшшы. Пісьменнік аддаў доўг і памяць сваім ваенным сябрам, аб чым упамінаецца ў эпіграфе да кнігі.

---

[10] Ibidem.

[11] А. Фядута, *У змаганні за праўду*, [у:] А. Карпюк, *Выбраныя творы*, с. 16.

[12] С. Андраюк, *Урок жыцця і творчасці*, с. 15.

> Што ні кажы, вайна кепска ўплывае на псіхіку чалавека. І хоць мы ваявалі ў імя міру ды будаўніцтва, але за гэты час разбуралі, забівалі... Не так хутка перастроіцца чалавеку... (410).

Гэтыя словы сведчаць аб жыццёвай мудрасці героя, аб свядомасці свайго становішча. Аказваецца, што Фядута памыляецца сцвярджаючы, што А. Карпюку добра ўдаецца толькі апісанне побыту.

Вайна гэта не толькі матэрыяльныя страты, але таксама псіхічныя знішчэння, скрыўлення, якія цяжка перамагчы для чалавека. Таму і сімвалічным з'яўляецца заканчэнне твора, калі Алёша не можа знайсці сабе месца. Яму прапануюць спакойную і з добрым ганарарам працу. Аднак у Кучынскага іншыя амбіцыі. Ён далучаецца да батальёну рэзерваў. „Слава партызанам, і на вяршыне ўсяго – я" (387).

Сапраўды, аповесць *Пушчанская адысея* Аляксея Карпюка займае сваё адметнае месца ў беларускай літаратуры. З дыстанцыі часу, аповесць пісалася семнаццаць гадоў (1961–1978), яна сведчыць пра балючую рэчаіснасць і пра псіхалагізм. Аповесць *Пушчанская адысея* А. Карпюка паказвае і з поўным правам адлюстроўвае не толькі побыт, але найперш псіхалогію чалавека ў не вельмі просты час, у час сутыкнення сіл дабра і зла, у час калі вайна раскрывала ў кожным чалавеку, што найгоршае. Тут паказаны рэаліі ваеннага часу і праблема псіхалогіі чалавека. Гэта аповесць не старэе, не губляе значэння з бегам часу.

## Streszczenie

*Temat partyzancki w opowieści Alaksieja Karpiuka „Odyseja puszczańska"*

Artykuł poświęcony jest analizie opowieści Alaksieja Karpiuka *Odyseja puszczańska*, której tematem jest ruch partyzancki na białorusko-polskim pograniczu. Główny bohater opowieści, Alosza Kuczyński, po zburzeniu uporządkowanego świata rolnika, zmaga się z brakiem zaufania do drugiego człowieka, niedowierzaniem, antagonizmami na tle narodowościowym, z pytaniem o wartość i cenę życia ludzkiego.

## Summary

*The guerrilla theme in Alaksiej Karpiuk's novel "Puszczanskaja adysieja"*

The article is dedicated to the analysis of Alaksiej Karpiuk's novel *Puszczanskaja adysieja* the theme of which is the guerrilla movement at the Byelorussian-Polish borderland. The novel's main character Alosza Kuczyński struggles with the problems of incredulity, the lack of trust between people, antagonisms of national nature, destroying an orderly farmer's world, the question about the value and the price of human life.

**Key words:** Belorussian prose, the Second Word War, guerillas, Polish-Belorussian borderland, biographical work, patriotism, the price of human life.